Смерць нямецкім акупантам!

Прачытай і перадай другому.

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗА РАДЗІМУ

Орган Мозырскага РККП(б)Б

№2 Субота, 2 кастрычніка 1943г.

Библиотека АН БССР

Бызваляюцца нашы суседзі — гамельчане. Працоўныя Веткаўскага, Цэрахаўскага раёнаў зноў уступілі ў брацкую сям'ю Совецкіх народаў.

Чырвоныя воіны пабеданосна ідуць да нас, знішчаючы гітлераўскую погань.

# Чырвоная Армія вызваляе Беларусь!

## Дастойна сустрэнем Вызваліцельніцу

Доблесная Чырвоная Армія ў жорсткіх баях крок за крокам вызваляе родную Беларускую зямлю. Ужо свабодна ўздыхнулі працоўныя Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Мсціслаўскага, Веткаўскага раёнаў.

Гул артылерыйскай кананады чуваць на П а л е с с і. Ён прадсказвае хуткае вызваленне знямогшага, ісцеозанага насельніцтва ад нямецка-фашысцкіх галаварэзаў.

Коцячыся на захад ад магутных удараў Чырвонай Арміі, гітлераўскія мярзотнікі ведаюць, што больш ім не быць на совецкай зямлі, таму яны канчаткова апустошваюць і без таго апустошаную за два гады іх панавання.

Усё вывозяць у звярыны бярлог — Германію, чаго не паспяваюць — спальваюць. Працаздольнае насельніцтва гоняць у рабства, а непрацаздольнае — расстрэльваюць.

Працоўныя Мазыршчыны, партызаны і партызанкі! Усімі сіламі дапамагайце нашым слаўным воінам хутчэй знішчыць нямецкіх мярзотнікаў.

Дастойна сустрэнем нашу вызваліцельніцу — Чырвоную Армію!

Смерць нямецкім акупантам!

## На франтах Айчыннай вайны

### АПЕРАТЫЎНЫЯ ЗВОДКІ ЗА 29 І 30 ВЕРАСНЯ

На Кіеўскім напрамку нашы войскі ў выніку жорсткіх баёў, зламаўшы супраціўленне праціўніка, фарсіравалі раку Дняпро і авалодалі чыгуначным вузлом Дарніца, а таксама, адкінуў нямецкія войскі, авалодалі на правым беразе ракі моцна ўмацаванымі пунктамі Траяшчына, Труханаў Остраў, Пазнякі, Асакоркі і інш.

Войскі Стэпавага фронту пасля 3-х дзённых жорсткіх баёў, зламаўшы супраціўленне праціўніка, 29 верасня штурмам авалодалі гор. Крэменчуг.

На Магілёўскім напрамку нашы войскі 30 верасня працягвалі развіваць паспяховае наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 12 да 20 км., фарсіравалі раку Сож. Збаямі авалодалі горадам і чыгукачным вузлом Крычаў, а таксама больш 170 іншымі насялёнымі пунктамі, сярод якіх буйныя насялёныя пункты: Лукі, Мікуліна, Лебедзева, Нікадзімава, Кледнявічы, Ярцэўка і інш.

На Гомельскім напрамку нашы войскі працягвалі наступленне і, прасунуўшыся на асобных участках уперад за 2 дні ад 16 да 22 км. авалодалі раённымі цэнтрамі Гомельскай областці Ветка і Свяцілавічы, а таксама занялі звыш 230 іншых насялёных пунктаў, сярод якіх буйныя насялёныя пункты: Курбакі, Горы, Спайкі, Марозаўка, Латакі, Іванаўка, Палужэная Рудня, Глохаўка, Несцераўка.

На Віцебскім напрамку нашы войскі, зламаў супраціўленне праціўніка, працягваюць наступленне.

На працягу 28 і 29 верасня нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 170 нямецкіх танкаў, у паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта больш 84 самалётаў праціўніка.

# узмоцнім партызанскі удар па нямецкіх захопніках

## АДПОМСЦІЛІ

Насустрач партызанам з вёскі Ю. бегла дзяўчына. Яшчэ здалёк можна было заўважыць яе ўсхваляваны твар.

—Даражэнькія партызаны,— з слязамі на вачах пачала гаварыць дзяўчына,— вёску рабуюць немцы. Усё забіраюць, а людзей зганяюць у адно памяшканне для адпраўкі ў Германію. Не лічацца ні з кім. Я вось уцякла, дык забралі шасцідзесяцігадовага бацьку. Браты мае, адпомсціце бандытам!

Больш нічога не змагла сказаць дзяўчына. З яе вачэй пакаціліся буйныя каплі слёз.

Гэтыя словы моцна залезлі ў сэрцы народных мсціўцаў. Яны рашылі звесці рахунак з гітлераўскімі рабаўнікамі.

Праз поўгадзіны група смельчакоў пад камандаваннем Сашы Т. ужо сядзела ў засадзе.

Паказалася аўтамашына з эмблемай „сс", запоўненая фашыстамі. Падпусціўшы яе на блізкую адлегласць, партызаны адкрылі ружэйны і аўтаматны агонь.

4 бандыты былі забіты, а астатнія ў паніцы разбегліся. Пакінуўшы 2 аўтамашыны, 2 вінтоўкі, 2 пісталеты і многа нарабаванага дабра.

Уладзімір М.

## НЕ ДАЕХАЛІ...

З награбленым сялянскім дабром немцы ехалі ў Мозыр. Але... не даехалі. За вёскай Х. аўтамашына ўзарвалася на мінах, пастаўленых дыверсійнай групай Андрэя К.

6 фашыстаў былі забіты на месцы і 3—ранены. Так атрымалі справядлівую кару гітлераўскія рабаўнікі.

Пятро Л.—

камісар Н-скага партызанскага атрада.

## 3 эшалоны пад адкосам

Добра дзейнічае дыверсійная група Вячэслава К. Ні ў дзень, ні ноччу не дае супакою нямецкім акупантам. Толькі за апошні час пушчана пад адкос 2 воінскіх эшалоны працуніка з жывой сілай.

Днямі гэтая група пусціла пад адкос трэці воінскі эшалон. У выніку крушэння знішчана: паравоз, 4 вагоны, 2 платформы і забіта звыш 100 немцаў.

Выключна смела дзейнічаюць камсамольцы-падрыўнікі: Дзмітрый П., Іван К., Мітрафан С, і Фёдар К.

Аляксандр Ж—

палітрук партызанскага атрада

## Затрымалі работу чыгункі

Многа патрацілі немцы сіл, каб пусціць у ход чыгунку ў Н-скім раёне. Больш года рамантавалі чыгуначны мост, рабілі дзоты і нагляддальныя вышкі, выкашвалі збожжа кругом чыгуначнага палатна. Замянялі адну варту другой, але справы не ладзіліся. Ні адзін эшалон не дайшоў па свайму назначэнню.

Не так даўно група нашых партызан зноў зрабіла налёт на гэтую чыгунку. Удар быў такі нечаканы, што чыгуначная варта ўся разбеглася і толькі праз поўгадзіны адкрыла беспарадачную страляніну. Але ўжо позна, заданне было выканана. Чыгунка спыніла работу на 3 дні.

Выключна добра дзейнічалі пры выкананні гэтай аперацыі падрыўнікі групы Паўла Д. —славакі: Іван Я., Іван З. і камсамольцы—Дзмітрый П., Васіль Б., Уладзімір П., Міхаіл Ж., іван З.

Аляксандр Ж—

кам. Н-скага партызанскага атрада.

## У адказ Чырвонай Арміі

Не адзін варожы эшалон узарваўся на мінах Паўла Д. Дзесяткі гітлераўцаў навечна загнаны ў зямлю, І на гэты раз Павел яшчэ з большаю акуратнасцю падлажыў увесістую порцыю ўзраўчаткі пад рэльсы чыгункі.

Чакаць доўга не прышлося. Як змяя выпаўз з-за лесу цягнік з фашысцкай свастыкай. Раздаўся выбух, паравоз носам зарыўся ў зямлю.

Звыш 50 гітлераўцаў знайшлі сабе магілу пад абломкамі вагонаў.

Іван Б.

## „ТАТАЛЬНЫ" ФРЫЦ.

Партызаны—Дзмітрый К., Іван З. ў вёсцы Б-М злавілі „татальнага" фрыца, які рабаваў сялян.

Агіднае стварэнне: гарбаты, сляпы на адно вока, разбіты паралічам.

Калі ўбачыў партызан, тросся ад страху, як асінавы ліст; і ўсё прасіў захаваць яго жыццё.

Андрэй К.

Рэдакцыйная калегія

Выд. Мозырскага РК КП(б)Б